В.А. Юнеева,
метадыст аддзела вучэбна-метадычнага забеспячэння
павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Ацэнка выніковасці адукацыйнага працэсу: вопыт правядзення анкетавання слухачоў павышэння кваліфікацыі

Сацыяльныя і эканамічныя з'явы, якія адбыліся ў Беларусі за апошняе дзесяцігоддзе, прывялі да жорсткай канкурэнцыі на рынку працы. Да спецыялістаў прад'яўляюцца ўсё больш высокія патрабаванні, фарміруецца канкурэнтнае асяроддзе, у якім рэалізаваць сябе ў прафесійнай дзейнасці мае магчымасць толькі спецыяліст высокага ўзроўню кваліфікацыі, які заўсёды імкнецца да самаразвіцця. У сувязі з гэтым узрастаюць роля і значэнне сістэмы ДАД, якая прызначана ўдасканальваць узровень кваліфікацыі работніка, яго прафесійныя навыкі.

З мэтай павышэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу ў Інбелкульце праводзіцца анкетаванне слухачоў. Перш за ўсё яно накіравана на выяўленне ступені задаволенасці якасцю адукацыйных паслуг. Тое, што ўлік запытаў асобы з'яўляецца такім жа значным, як і ўлік патрэбнасцей грамадства і дзяржавы, падкрэслівалі многія даследчыкі і педагогі. Сцвярджаецца, што якасць адукацыі праяўляецца ў яе «способности удовлетворять определенные потребности гражданина, общества, государства в соответствии с назначением этого образования» [2, с. 40], а вынікі адукацыі павінны адпавядаць сацыяльным і асабістым чаканням [3, с. 8].

Анкетаванне слухачоў адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў праводзіцца ў Інбелкульце з 2010 г. Але з улікам сучасных патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу ў 2015 г. створана электронная сістэма анкетавання пры дапамозе сэрвісаў google, прызначаная для запаўнення рэспандэнтамі ў рэжыме on-line. Выкарыстанне інтэрнэт-тэхналогій дазваляе адсочваць вынікі анкетавання ў рэальным часе, істотна скараціць срокі і час, неабходныя для аналізу даных. Анкетаванне праводзіцца ў кожнай групе павышэння кваліфікацыі ў канцы навучання.

Пачынаецца анкета кароткім блокам, які ўключае пытанні аб сацыяльна-дэмаграфічным статусе рэспандэнтаў. Ён неабходны для аналізу даных і забяспечвае больш дакладную ацэнку вынікаў анкетавання.

Па даных анкетавання можна заўважыць пэўныя праблемы, якія патрабуюць вырашэння. Напрыклад, адсутнасць у некаторых кіруючых работнікаў і спецыялістаў сферы культуры профільнай адукацыі. Так, за I квартал 2016 г. у Інбелкульце былі апытаны 462 чалавекі. З іх 42 чалавекі (9 %) не мелі профільнай адукацыі (гл. дыяграму 1). Праблема неадпаведнасці адукацыі работніка пасадзе,





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якую ён займае, існуе, у асноўным, сярод работнікаў клубных устаноў і другіх культурна-асветных арганізацый: музеяў, бібліятэк і інш. Для яе вырашэння створана база слухачоў без профільнай адукацыі, якія запрашаюцца да засваення адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў падчас фарміравання ў Інбелкульце адпаведных груп.

*Дыяграма 1*




У асноўнай частцы анкеты слухачам задаюцца пытанні аб тым, што заахвоціла іх прайсці навучанне па адукацыйнай праграме павышэння кваліфікацыі і ў якой ступені апраўдаліся чаканні. У некаторых выпадках рэспандэнт першапачаткова адзначаў, што прыехаў па распараджэнню кіраўніка, але пасля змог пераасэнсаваць змест сваёй прафесійнай дзейнасці і павысіць матывацыю для самаразвіцця і самаўдасканалення, што сведчыць аб высокай эфектыўнасці дзейнасці Інбелкульта, таму што задачай павышэння кваліфікацыі з’яўляецца не толькі фарміраванне новых ведаў, уменняў, навыкаў, якія будуць забяспечваць прадуктыўную прафесійную дзейнасць бліжэйшыя 5 гадоў, але і фарміраванне ў слухача новых матываў для самаадукацыі. Асабліва гэта важна для настаўнікаў дзіцячых школ мастацтваў, бо яны выхоўваюць маладое пакаленне ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі грамадства. Сёння становіцца актуальным уменне пастаянна развівацца, быць не толькі асобай, якая ўмее прыстасоўвацца да зменлівых умоў, але і творча вар’іраваць гэтыя ўмовы, адпавядаць прынцыпу «адукацыя праз усё жыццё».

На дыяграме 2 прадстаўлены асноўныя матывы павышэння кваліфікацыі слухачоў Інбелкульта, якія засвоілі адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у І квартале 2016 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дыяграма 2*




Слухачам прапануецца ацаніць змест адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі па наступных крытэрыях:

адпаведнасць зместу праграмы прафесійным патрэбам і запытам;

актуальнасць і навізна інфармацыі;

карысць для асабістага росту;

магчымасць практычнага выкарыстання набытых ведаў і інш.

Адказы слухачоў на пытанні з'яўляюцца падставай для карэкціроўкі зместу заняткаў, якія праводзяцца прафесарска-выкладчыцкім саставам Інбелкульта.

Пры анкетаванні ацэньваецца таксама ўзровень забеспячэння праграмы павышэння кваліфікацыі інфармацыйна-метадычнымі матэрыяламі: прадастаўленне нарматыўных прававых дакументаў, вучэбна-метадычнай, нотнай і іншай літаратуры, аўдыя- і відэафайлаў з мэтай іх выкарыстання ў прафесійнай дзейнасці, абмене вопытам; мультымедыйныя прэзентацыі. Аналіз адказаў паказвае, што большасць слухачоў высока ацэньвае ўзровень забеспячэння праграмы — у сярэднім на 6 балаў па сямібальнай шкале.

Пры ацэнцы арганізацыі адукацыйнага працэсу ўвага надаецца і такім умовам, як аснашчэнне і ўкамплектаванасць бібліятэкі, арганізацыя харчавання, умовы пражывання, наяўнасць і стан вучэбных аўдыторый, суправаджэнне адукацыйнага працэсу і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэспандэнтам прапануецца адзначыць найбольш актуальныя і цікавыя тэмы вучэбных заняткаў, якія былі запатрабаванымі і ўнеслі значны ўклад у развіццё прафесійнай кампетэнтнасці слухачоў.

Дзякуючы адказам можна адсочваць запатрабаванні работнікаў сферы культуры:

у атрыманні ведаў, уменняў і навыкаў у розных галінах прафесійнай дзейнасці. Напрыклад, выяўлена, што для педагагічных работнікаў актуальнымі з'яўляюцца тэмы па наступных кірунках: нарматыўна-прававое і метадычнае забеспячэнне вучэбна-выхаваўчага працэсу, выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання, методыка выкладання дысцыплін мастацкага профілю, педагагічная псіхалогія [4];

у абмене вопытам работы з канкрэтнымі выкладчыкамі і вядомымі дзеячамі культуры і мастацтва.

Мэтазгодна фарміраваць вучэбныя і вучэбна-тэматычныя планы для адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі, зыходзячы з запатрабаванняў, а таксама ўлічваць іх пры перспектыўным планаванні, зацвярджэнні тэматыкі праграм, размеркаванні нагрузкі прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Вынікі анкетавання абмяркоўваюцца на пасяджэннях кафедры з мэтай удасканалення педагагічнага майстэрства прафесарска-выкладчыцкага саставу, вызначэння напрамкаў для самаразвіцця выкладчыкаў.

У цэлым, паводле вынікаў анкетавання ў I квартале 2016 г. пасля засваення адукацыйнай праграмы большасць слухачоў поўнасцю задаволена навучаннем (83 % — 383 чалавекі з 462). У будучыні яны плануюць павышэнне кваліфікацыі толькі ў Інбелкульце. Сярод асноўных вынікаў навучання вылучаюць абмен вопытам з калегамі, павышэнне агульнакультурнага ўзроўню і матывацыі для далейшага самаўдасканалення (гл. дыяграму 3).

*Дыяграма 3*




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Завяршаецца анкета адкрытым пытаннем, дзе слухачы маюць магчымасць унесці свае прапановы па ўдасканаленню праграмы навучання (зместу, форм, метадаў) і працы па арганізацыі павышэння кваліфікацыі; пазначаюць тэмы, якія іх найбольш цікавяць.

Інфармацыя аб выніках анкетавання, прадстаўленая ў выглядзе справаздачы, выкарыстоўваецца прафесарска-выкладчыцкім саставам кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін, педагагічнымі работнікамі навукова-метадычных аддзелаў Інбелкульта.

Анкетаванне садзейнічае пошуку новых і актуальных для работнікаў сферы культуры тэм, інавацыйных падыходаў, тэхналогій, метадаў навучання ў сістэме ДАД, з'яўляецца часткай кантролю якасці адукацыі.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. № 101 [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 26 сак. 2014 г., № 20 // ЭТАЛОН. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нац. цэнтр. прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. — Мінск, 2014.
2. *Кац, А.М.* Качество образования : подлинный смысл и бессмысленные процедуры / А.М. Кац // Директор школы. — 2001. — № 3. — С. 39—50.
3. *Смирнов, М.В.* Развитие системы оценки качества образования с учётом требований рынка труда : автореф. дис. … канд. экономич. наук : 08.00.05 / М.В. Смирнов ; Гос. ун-т управления. — М., 2005. — 29 с.
4. *Юнеева, О.А.* Проблемы развития профессиональной компетентности педагогических работников сферы культуры в системе дополнительного образования взрослых / О.А. Юнеева // Асоба ў кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў : матэрыялы I Міжнар. навук. канф. памяці Я.Д. Грыгаровіч (Мінск, 12 лістапада 2014 г.) / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: В.Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. — Мінск : БДУКМ, 2015. — С. 369—373.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ